Случчыне

Я нізка пакланюся той
зямлі,
Дзе першы крок свой некалі
ступіла.
Дзе слёзы барвінкамі прараслі
Праз вечны боль -
матуліну магілу.
Дзе сум і радасць у адным
вянку
Спляталіся ў дзівосны час
вясновы.
Шчыміць душа - сасмяглую
раку,
Як і раней, лічу жыцця
асновай.
Тут родныя трымаюць карані
І салаўі спяваюць гэтак дзіўна.
Мой лёс, прашу, мяне абарані,
Не дай чужою стацца
на радзіме.
Куды б мяне дарогі ні вялі,
Я з кожным днём,
як з кожным новым вершам,
Ўсім сэрцам прырастаю
да зямлі,
Дзе некалі зрабіла
крок свой першы.

З. Падліпская

Роднае слова. – 2018. – № 9. – С. 73.